6. Подумайте, почему именно такие науки, как математика и астрономия, были очень развиты у коренных жителей Америки? С какими нуждами это было связано?
7. На основе приведённых отрывков из свидетельств Диего де Ланды расскажите о том, что вас больше всего удивило в повседневной жизни народа майя.
8. Попробуйте составить своё мнение об уровне развития индейских народов.

**Литература для дополнительного использования**

Блестящее наследие Африки. — М. : Терра, 1997. — 168 с.

*Гуляев, В. И.* Америка и Старый свет в доколумбову эпоху / В. И. Гуляев. — М. : Наука, 1968. — 181 с.

*Ершова, Г. Г.* Древняя Америка: полёт во времени и пространстве : в 2 т. / Г. Г. Ершова. — Т. 2: Мезоамерика.— М. : Алетейа, 2002. — 392 с.

Латинская Америка. Энциклопедический справочник : в 2 т. — М. : Советская энциклопедия, 1982. — Т. 2. — 656 с.

Мифы и легенды народов мира. Америка, Австралия и Океания : сб. — М. : Литература, мир книги, 2004. — 480 с.

Священные письмена майя. — СПб. : Амфора, 2000. — 351 с.

gisdapamoga.by

# УСХОДНЕСЛАВЯНСКІЯ ПЛЯМЁНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***Урок па гісторыі Беларусі ў VI класе***

*Ірына Шчарбак, метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі метадычнага аддзела гісторыка-грамадазнаўчай і сацыякультурнай адукацыі НІА*

**Мэты:** стварыць умовы для развіцця мысленчых навыкаў праз аналіз вучэбнага матэрыялу, выдзяленне галоўнага; спрыяць развіццю памяці, увагі; арганізаваць дзейнасць вучняў па вывучэнні фактаў, гістарычных тэрмінаў, асэнсаванні падзей праз пастаўленыя задачы; стварыць умовы для выхавання цікавасці да прадмета, патрыятызму, павагі да мінулага народа; спрыяць выхаванню рэфлексійнай культуры.

**Задачы**

1. Характарызаваць працэс асіміляцыі балцкага насельніцтва на беларускіх землях.
2. Фарміраваць уяўленні аб адрозненнях усходнеславянскіх плямён.
3. Вучыць работаць з гістарычнай картай і гістарычнымі дакументамі.

**Тып урока:** урок засваення новага матэрыялу.

**Матэрыяльнае забеспячэнне:** па 6 аркушаў паперы і маркер (на кожную групу), магніты (не менш 18) ці скотч, урыўкі з дакументаў, любыя карты з зонай рассялення ўсходнеславянскіх плямён, малюнкі ўпрыгожанняў славян (без подпісаў назвы племені). Усе групы атрымліваюць дадатковы матэрыял.

**Паняцці ўрока:** дрыгавічы, крывічы, радзімічы, скроневыя кольцы, славянізацыя балтаў.

**План**

1. Славянска-балцкае ўзаемадзеянне.
2. Крывічы-палачане.
3. Дрыгавічы.
4. Радзімічы.

**I. Арганізацыйны момант.**

Настаўнік абвяшчае тэму ўрока, план, разам з вучнямі ставіць задачы і фармулюе мэту ўрока.

**II. Этап падрыхтоўкі вучняў да засваення новых ведаў.**

**Настаўнік. Якія групы плямён утварыліся ў выніку пранікнення індаеўрапейцаў у Еўропу? (Балты, славяне, германцы.)**

Якая з гэтых груп рассялялася на землях сучаснай Беларусі? **(Балты.)**

Калі славяне з'явіліся ў Сярэднім Падняпроўі? **(VI ст.)**

У якіх напрамках ішло засяленне беларускіх зямель? (З поўдня ўздоўж Дняпра і Прыпяці, з поўначы Усходняй Еўропы.)

Як вы думаеце, што стала з мясцовым насельніцтвам, балтамі, калі на гэтую зямлю прыйшлі славяне?

*Адказы вучняў.*

Прачытаем пункт 1 падручніка і знойдзем правільны адказ на прапанаванае пытанне.

> Запіс у сшытку: *славянізацыя балтаў – паступовы працэс іх зліцця са славянамі.*
>
> *У VIII–IX стст. утварыліся своеасаблівыя саюзы плямён — крывічы, радзімічы, дрыгавічы.*

**Што зблізіла гэтыя плямёны? (Язычніцтва, мова і лад жыцця.)**

**Што славяне пераймалі ў балтаў? (Гарадзішчы, упрыгожанні.)**

**Што балты ўзялі ад славян? (Навыкі ў рамястве і земляробстве, арганізацыю кіравання – правадыры і войска.)**

**III. Этап засваення новых ведаў.**

Гэты этап арганізуецца як самастойная работа вучняў у трох групах па 2–4 пунктах плана. Кожная з іх адказвае за адзін саюз плямён: першая – крывічы, другая – радзімічы, трэцяя – дрыгавічы.

Кожная група чытае свой матэрыял у падручніку і ўрыўкі з дакументаў, шукае адказы на пастаўленыя пытанні. Кожны адказ запісваецца маркерам на асобным аркушы паперы. Для адказу пра ўпрыгожанні славян трэба падабраць малюнак. Затым з лістоў з дапамогай магнітаў запаўняецца табліца на дошцы. На самастойную работу адводзіцца каля 15 мінут.

| Пытанні для аналізу | Крывічы | Радзімічы | Дрыгавічы |
|---|---|---|---|
| Рассяленне | | | |
| Паходжанне назвы | | | |
| Суседзі | | | |
| Галоўныя гарады | | | |
| Скроневыя кольцы | | | |
| З летапісу (першае датаванае ўзгадванне) | | | |

Атрыманыя адказы правяраюцца, адказы запісваюцца ў сшытак, дзе будуецца такая ж табліца.

**IV. Этап замацавання новых ведаў.**

Што агульнага мы можам назіраць у плямён? **(Рассяленне ўздоўж рэк, паходжанне назвы ад правадыра.)**

Якое галоўнае адрозненне? **(Скроневыя кольцы.)**

Па чым вы здагадаліся, які малюнак адпавядае «вашаму» племені?

Якія паселішчы былі пабудаваны славянамі? **(Полацк, Тураў.)**

Якія плямёны былі суседзямі трох плямён? **(Валыняне, драўляне, северане, яцвягі, літва, крывічы пскоўскія і смаленскія.)**

Як вы думаеце, з якога дакумента былі прапанаваны ўрыўкі? **(Аповесць мінулых часоў.)**

Што вы даведаліся з рубрыкі «Гэта цікава», але не запісвалі ў табліцу?

**V. Этап інфарміравання вучняў пра х/з і каменціравання правіл яго выканання.**

Адкажыце на пытанні § 10. Паўтарыце паняцце «дзяржава», прычыны ўзнікнення і характэрныя прыкметы.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока і выстаўленне адзнак.**

**VII. Рэфлексія.**



gisdapamoga.by

***Дадатковы матэрыял да ўрока***

### Племянныя саюзы ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі (VIII—XI стст.)




### Дрыгавічы (упрыгожанні дрыгавіцкіх жанчын)



***1, 2, 8*** **— пацеркі з зерню;** ***3–5*** **— скроневыя кольцы;** ***6*** **— манетападобная прывеска (*1–9* — каляровы метал);** ***7*** **— пярсцёнак**

### Радзімічы (упрыгожанні з радзімічанскіх курганаў)



***1*** **— зоркападобная спражка;** ***2*** **— грыўна;** ***3, 6*** **— пацеркі;** ***4, 5, 9*** **— скроневыя кольцы;** ***7, 11, 12*** **— прывескі;** ***8*** **— пярсцёнак;** ***10*** **— каралі;** ***13*** **— падковападобная засцежка (*1, 2, 4, 5, 8, 9, 11–13* — каляровы метал;** ***3*** **— шкло;** ***6*** **— сердалік;** ***7, 10*** **— бронза і шкло)**

### Крывічы (упрыгожанні з крывіцкіх курганаў)



***1*** **— пярсцёнак;** ***2*** **— бранзалетападобныя скроневыя кольцы;** ***3, 5*** **— падвескі;** ***4, 13*** **— падковападобная засцежка;** ***6, 7*** **— грыўні;** ***8*** **— бразготка;** ***9, 11*** **— бранзалеты;** ***10*** **— паясная спражка;** ***12*** **— каменная пацерка (*1–11, 13* — каляровы метал,** ***12*** **— камень)**



gdzpamoga.by

### У год 6367 (859).

Варагі (варагамі на Русі называліся скандынаўскія купцы і воіны) з-за мора бралі даніну з чудзі, славян, меры і з усіх крывічоў. А хазары бралі з палян, северан і вяцічаў па срэбнай манеце і вавёрцы ад дыма.

### У год 6393 (885).

Паслаў Алег да радзімічаў:
«Каму вы даніну плаціце?».
Яны адказалі:
«Хазарам».
Сказаў ім Алег:
«Не давайце хазарам, а давайце мне».
І ўладарыў Алег над палянамі, драўлянамі, северанамі і радзімічамі, а з улічамі і ціверцамі ваяваў.

### У год 6488 (980).

Рагвалод гэта з-за мора прыйшоў і ўладарыў у Полацку. А Тур — у Тураве (Тураў цяпер гарадскі пасёлак у Житкавіцкім раёне Гомельскай вобласці), ад яго ж і назваліся людзі тураўцамі.

# ДОСТИЖЕНИЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСИ В 1920—1930-Х ГГ.

*История Беларуси, XI' класс*

*Ирина Стасюк, учитель истории первой квалификационной категории средней общеобразовательной школы № 26 г. Бреста*

**Цель и задачи:** познакомить учащихся с основными достижениями культуры Беларуси в 20—30-х гг. XX в.; рассмотреть основные направления, ход, итоги политики белорусизации; дать определение историческим терминам; отметить основные достижения белорусского общества в 20—30-х г. XX в.; прививать учащимся интерес к решению учебных задач; проводить параллель с современностью; формировать культуру языка; работать с различными источниками информации; заинтересовывать в высказывании своей точки зрения; воспитывать у учеников уважение к историческому прошлому, интерес к национальной истории.

**Тип урока** — изучение нового материала.

**Литература:** «История государства и права России в документах и материалах. 1930—1990-е гг.» (Минск, 2003); «Архитекторы Советской Белоруссии. Биографический справочник» (Минск, 1991); репродукции работ белорусских художников (Минск, 2007); «Навучальны дапаможнік па гісторыі Беларусі» (Мінск, 1998).

**План урока**

1. Организационный момент.
2. Причины, ход, итоги белорусизации.
3. Ликвидация безграмотности.
4. Развитие науки, литературы и театра.
5. Музыка, кино.
6. Проверка домашнего задания.
7. Домашнее задание.

**Оборудование:** карта Беларуси, исторический документ, схемы.

**Учитель.** Каждая страна стремится достигнуть успехов в улучшении жизни людей, их духовном развитии, занять достойное место среди других государств. Реформаторы предлагают свои изменения и решения проблем, которые должны способствовать развитию положительной динамики государства. Но не

gisdapamoga.by